грамадска-палітычная газэта

# >РУХуЕўропу>

№2(02) жнівень 2011г.

# ПАРЛАМЕНЦКАЯ АСАМБЛЕЯ САВЕТА ЕЎРОПЫ



Парламенцкая Асамблея (ПАСЕ) з'яўляецца адным з двух галоўных статутных органаў Рады Еўропы і прэзентуе інтарэсы асноўных палітычных партый, існых у дзяржавах – чальцах Арганізацыі. У рамках Асамблеі ажыццяўляюць супрацоўніцтва прадстаўнікі парламенцкіх структур 47 дэмакратычных дзяржаваў нашага кантынента, якія ўваходзяць у Раду Еўропы.

Парламенцкая Асамблея Рады Еўропы стала першым еўрапейскім парламенцкім форумам у гісторыі нашага кантынента. Маючы ў сваім складзе дэлегацыі 47 нацыянальных парламентаў, яна з'яўляецца адным з самых прадстаўнічых парламенцкіх форумаў Еўропы.

Асамблея разглядае актуальныя і перспектыўныя пытанні, якія датычацца праблемаў сучаснага грамадства і розных аспектаў міжнароднай палітыкі.

Вынікі працы Асамблеі адыгрываюць важную ролю ў азначэнні кірункаў дзейнасці Камітэта Міністраў, а таксама міжурадавага супрацоўніцтва ў рамках Рады Еўропы.

Гістарычныя падзеі ў дзяржавах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы ў пачатку 90-х гадоў паставілі перад Асамблеяй унікальную задачу: зрабіць свой унёсак у справу інтэграцыі гэтых краінаў у сям'ю еўрапейскіх дэмакратый і спрыяць сапраўднаму супрацоўніцтву парламентарыяў усіх дзяржаваў Еўропы. Такім чынам, Асамблея будуе Еўропу без межаў.

Дзякуючы заснаванаму Парламенцкай Асамблеяй у 1989 годзе статуту "адмыслова запрошанага", парламенцкія дэлегацыі краінаў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, якія не з'яўляліся паўнапраўнымі чальцамі Арганізацыі, змаглі прымаць удзел у пленарных паседжаннях Асамблеі і ў працы яе камісій без права голасу. Усталяваныя такім чынам кантакты і абмены садзейнічалі працэсу дэмакратызацыі ў гэтых краінах і паскорылі іх прыём у Раду Еўропы.

318 чальцоў Асамблеі і 318 іх намеснікаў абіраюцца або прызначаюцца нацыянальнымі парламентамі з іх уласнага складу. Лік парламентарыяў ад кожнай краіны вар'іруецца ад 2 да 18 у залежнасці ад колькасці яе насельніцтва. Склад нацыянальных дэлегацый у Асамблеі павінен прапарцыйна адлюстроўваць усе асноўныя палітычныя сілы або групы, прадстаўленыя ў нацыянальным парламенце.

У Асамблеі рэпрэзентаваныя пяць палітычных групаў: Група сацыялістаў (СОЦ), Група Еўрапейскай народнай партыі / хрысціянскіх дэмакратаў (ЕНП/ХД), Група еўрапейскіх дэмакратаў (ГЕД), Альянс лібералаў і дэмакратаў у падтрымку Еўропы (АЛДЕ), а таксама Група аб'яднаных еўрапейскіх левых (ОЕЛ). Некаторыя парламентары не прыналежаць ні да адной з названых палітычных групаў.

Чатыры разы на год у зале паседжанняў Палаца Еўропы ў Страсбурзе праходзяць тыднёвыя пленарныя паседжанні Парламенцкай Асамблеі. Яны адчыненыя для публікі.

Старшыня Асамблеі абіраецца з ліку яе чальцоў, па традыцыі на тры аднагадовых тэрміна. Старшыня і яго намеснікі (іх у цяперашні час 18), кіраўнікі пяці палітычных груп, а таксама старшыні Камісій ПАСЕ складаюць Бюро Асамблеі.

Акрамя гэтага, Асамблея абірае Генеральнага сакратара Рады Еўропы, яго намесніка, Генеральнага сакратара Парламенцкай Асамблеі, суддзяў Еўрапейскага суду па правах чалавека, а таксама Камісара па правах чалавека.

Асамблея працуе з матэрыяламі, адмыслова падрыхтаванымі для яе профільнымі камісіямі, якія курыруюць наступныя кірункі: палітычныя пытанні, юрыдычныя пытанні і правы чалавека, сацыяльныя пытанні, пытанні аховы здароўя і сям'і, культуры, навукі і адукацыі, аховы навакольнага асяроддзя і сельскай гаспадаркі, уладкаванні тэрыторый і мясцовага самакіравання, пытанні эканомікі і развіцці, міграцыі, уцекачоў і дэмаграфіі, роўнасці магчымасцяў для мужчын і жанчын.

Пасля ўступа дзяржавы ў Раду Еўропы Парламенцкая Асамблея сочыць за тым, як гэтая краіна выконвае ўзятыя на сябе абавязкі. У 1997 г. для гэтай мэты была створана адмысловая Камісія па маніторынгу. Гэтая камісія сочыць таксама за тым, як краіны-чальцы выконваюць, узятыя на сябе абавязк ўжо пасля ўступу ў Раду Еўропы.

Камісія па маніторынгу абавязана раз на год падаваць Асамблеі справаздачу пра асноўныя вынікі сваёй дзейнасці.

Парламенцкая Асамблея асабліва актыўна дзейнічае ў вобласці абароны правоў чалавека. За апошнія некалькі гадоў яна прыняла рэзалюцыі па наступных пытаннях: стварэнне міжнароднага суду для разгляду злачынстваў, здзейснен ў ваенны час; секты і новыя рэлігійныя плыні; правы меншасцяў; правы дзяцей; абарона правоў асобаў, якія шукаюць прытулку ў іншай краіне; СНІД і правы чалавека; гандаль

# ПАРЛАМЕНЦКАЯ АСАМБЛЕЯ САВЕТА ЕЎРОПЫ

дзецьмі і іншыя формы эксплуатацыі дзяцей і гэтак далей.

Яе прапановы аб адмене смяротнага пакарання ў мірны час, аб Канвенцыі па папярэджанні катаванняў і нялюдскага або зневажальнага абяходжання, Рамачнай канвенцыі аб абароне правоў нацыянальных меншасцяў былі ў наступным разгледжаныя Камітэтам Міністраў і сталі юрыдычнымі нормамі Рады Еўропы.

Дзяржавы-чальцы і іх прадстаўнікі ў Парламенцкай Асамблеі:

Аўстрыя (6), Азербайджан (6), Албанія(4), Андора (2), Арменія (4), Бельгія (7), Балгарыя (6), Боснія і Герцагавіна (5), Вугоршчына (7), Нямеччына (18), Грэцыя (7), Грузія (7), Данія (5), Ірландыя (4), Ісландыя (3), Іспанія (12), Італія (18), Кіпр (3), Латвія (3), Літва (4), Ліхтэнштайн (2), Люксембург (3), "Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія" (3), Мальта (3), Малдова (5), Манака (2), Нідэрланды (7), Нарвегія (5), Польшча (12), Партугалія (7), Расея (18), Румынія (10), Сан-Марына (2), Сербія (7), Славакія (5), Славенія (3), Злучанае Каралеўства (18), Турцыя (12), Украіна (12), Фінляндыя (5), Францыя (18), Харватыя (5), Чарнагорыя (3), Чэхія (7), Швейцарыя (6), Швецыя (6), Эстонія (3).

Статут назіральніка ў Парламенцкай Асамблеі маюць парламенты Канады, Ізраілю і Мексікі.

Дзеянне статуту "адмыслова запрошанага" для Беларусі было прыпынена 13 студзеня 1997 года.

## СЦЯГ ЕЎРАСАЮЗА

Сцяг Еўрапейскага Звяза з'яўляецца не толькі знакам ЕС, ён азначае таксама цэласнасць усёй Еўропы. 12 зорак – гэта знак круга ідэалаў адзінства, салідарнасці і згоды паміж еўрапейскімі народамі.

Лік "12" не мае адносінаў да колькаснага складу ЕС. У традыцыйных інтэрпрэтацыях "дванаццаць" сімвалізуе завершанасць, дасканаласць і цэласнасць. У сувязі з гэтым сцяг Еўрасаюза не будзе змяняцца пры далейшым пашырэнні ЕС.



## ГІМН ЕЎРАСАЮЗА

"Ода да радасці" – музыка з Дзявятай сімфоніі Бетховена - таксама сімвалізуе і ЕС, і Еўропу ў цэлым. Інтэрнацыянальная мова музыкі выяўляе ідэалы, на якіх пабудавана садружнасць – волю, роўнасць, сяброўства, салідарнасць і свет. Гімн Еўрапейскага Звяза выконваецца без слоў.

У 1985 г. краіны Еўрапейскага Звяза прынялі "Оду да радасці" ў якасці афіцыйнага гімна ЕС. Пры гэтым дзяржаўныя гімны краін-удзельніц засталіся ранейшымі.

Дэвіз Еўрасаюза: "Адзінства ў разнастайнасці". Дэвіз азначае, што Еўрапейскі Звяз аб'ядноўвае жыхароў краін Еўропы, іх высілкі і працу ў мэтах міру і росквіту. Разнастайнасць традыцый, культур і моў – гэта пазітыўны шматгранны фонд садружнасці.

## ЕЎРА-АДЗІНАЯ ЕЎРАПЕЙСКАЯ ВАЛЮТА

1 студзеня 1999 гады 11 дзяржаў Еўрасаюза: Аўстрыя, Бельгія, Нямеччына, Галандыя, Ірландыя, Іспанія, Італія, Люксембург, Партугалія, Фінляндыя, Францыя ўвялі новую агульную валюту еўра як сродак плацяжу. Роўна праз два гады еўра прыняла 12-ая краіна - Грэцыя. Тэрыторыя, на якой еўра ўведзена як валюта, завецца еўразонай.

Да канца 2001 г . еўра існавала толькі ў безнаяўнай форме. У гэтай валюце можна было адкрыць банкаўскі рахунак, аднак абнаявіць толькі ў нацыянальных банкнотах і манетах па цвёрдым курсе. Існавалі крэдытныя карты ў еўра, якімі можна было аплаціць у крамах.

Гэта быў падрыхтоўчы перыяд, неабходны для прызвычайвання людзей да новых коштаў (на цэнніках паказвалася два кошты – у нацыянальнай валюце і еўра). Да таго ж існавалі тэхнічныя складанасці – бо надрукаваць трэба было каля 15 млрд. банкнот і 51 млрд. манет. У зварот наяўныя грошы паступілі з пачаткам 2002 г.

Галоўны офіс Цэнтральнага Банка знаходзіцца ў Франкфурце-на-Майне (Нямеччына).

Сёння ўжо 16 краінаў зрабілі еўра сваёй валютай, адмовіўшыся ад уласных.

Усе краіны-ўдзельніцы Еўрасаюза маюць права ўвайсці ў еўразону, пры ўмове, што яны выконваюць вызначаныя патрабаванні да крэдытна-грашовай палітыкі. А ўсе новыя чальцы ЕС абавязаны з часам перайсці на еўрапейскую валюту.

## ДЗЕНЬ ЕЎРОПЫ

9 траўня 1950 гады міністр замежных спраў Францыі Роберт Шуман упершыню прапанаваў ідэі, пакладзеныя ў аснову стварэння Еўрасаюза. У дадзенай прапанове, вядомым як "Дэкларацыя Шумана", гаворка ішла пра забеспячэнне мірных адносін паміж краінамі.

Такім чынам, 9 траўня лічыцца днём нараджэння Еўрапейскага Звяза.

Дзень Еўропы – адзін са знакаў ЕС, якія вызначаюць палітычнае адзінства еўрапейскіх краін.

# СЛАВАКІ ПРЫРАЎНЯЛІ КАМУНІЗМ ДА НАЦЫЗМУ

У Славакіі абмяркоўваюць прыняты закон, па якім грэбаванне ці адмаўленне злачынстваў камунізму ў краіне будзе карацца як крымінальнае злачынства. Такім чынам, Славакія ўслед за Польшчай, Чэхіяй, Вугоршчынай і Літвой у сутнасці параўнала камунізм і нацызм па выніках гэтых злачынных таталітарных рэжымаў.

Кожны, хто паставіць пад сумнеў, паспрабуе адмаўляць ці апраўдаць злачынствы камуністычнага рэжыму, як і злачынствы фашызму ці Халакост, можа быць асуджаны на тэрмін ад шасці месяцаў да трох гадоў – так прадугледжвае закон пра змены ў Крымінальным кодэксе Славакіі, які пасля подпісу прэзідэнта павінен уступіць сілу з 1 верасня.

Таго, каб злачынствы камунізму былі прыраўняныя да злачынстваў нацызму, шмат гадоў дамагалася Канфедэрацыя палітычных зняволеных Славакіі. Левыя ж палітычныя сілы не дапушчалі новы закон на абмеркаванне ў славацкім парламенце ці адмаўлялі яго зусім. Па меркаванні старшыні Канфедэрацыі палітычных зняволеных Славакіі Антона Срголца, хоць і са спазненнем у 20 гадоў, і ўсё ж вельмі важна, што справядлівасць перамагла.

"Камунізм і нацыянал-сацыялізм, Сталін і Гітлер – гэта дзве аднолькавыя буйныя злачынныя сістэмы. Пра злачынствы, здзейсненыя камуністамі ва Ўсходняй Еўропе, найперш у былым Савецкім Звязе, нельга забыцца", – сказаў Антон Срголец.

Па дадзеных славацкага Інстытута нацыянальнай памяці, ахвярамі камуністычнага рэжыму ў Славакіі сталі больш 70 тысячаў чалавек. Былі расстраляныя нявінныя людзі, тысячы славакаў папакутавалі ад раскулачвання, палітычных пераследаў; пераважна скончылі свае жыцці ў турмах манашкі і манахі, манастыры і касцёлы былі знішчаны ці разрабаваны.

Па меркаванні часткі славацкай Канфедэрацыі палітычных зняволеных, галоўнае сёння - не пакаранне, галоўнае – сказаць праўду пра злачынны камуністычны рэжым.

# ПОЛЬШЧА АПЭЛЮЕ У СПРАВЕ БЯЛЯЦКАГА

Міністэрства замежных справаў Польшчы асуджае затрыманьне беларускага праваабаронцы **Алеся Бяляцкага** і мае намер заклікаць партнэраў па Эўразьвязу прыняць меры, якія гарантуюць бясьпеку актывістам грамадзянскай супольнасьці Беларусі. Пра гэта гаворыцца ў заяве МЗС Польшчы.

Арышт Бяляцкага зьнешнепалітычнае ведамства Польшчы разглядае як "чарговы прыклад поўнай адсутнасьці жаданьня беларускіх уладаў вярнуцца на шлях эўрапейскіх дэмакратычных каштоўнасьцяў". "Выкарыстаньне міжнародных пагадненьняў аб падатковай інфармацыі з мэтай рэалізацыі палітыкі рэпрэсій уяўляе сабой скандальнае парушэньне духу міжнароднага супрацоўніцтва", - адзначаецца ў заяве.

МЗС Польшчы заклікае афіцыйны Менск да неадкладнага вызваленьня праваабаронцы, нагадваючы, што Алесь Бяляцкі зьяўляецца актыўным удзельнікам дэмакратычнага руху Беларусі, і ў чэрвені гэтага году ва Ўроцлаве яму была ўручаная Прэмія Свабоды.

Польшча і ўвесь Эўразьвяз цалкам салідарныя з затрыманым, падкрэсьліваецца ў заяве. Польскі МЗС абяцае заклікаць партнэраў па ЭЗ распачаць эфэктыўныя крокі, якія б гарантавалі бясьпеку прадстаўнікам беларускай грамадзянскай супольнасьці, вымушаным дзейнічаць дзеля дэмакратыі ў Беларусі па-за яе межамі.

# МІНІСТАР ЗАКЛІКАЕ МІРНА АДДАЦЬ УЛАДУ

Міністар замежных справаў Польшчы **Радаслаў Сікорскі** заклікаў Аляксандра Лукашэнку пачаць перамовы пра мірную перадачу ўлады і не трымацца за сваю пасаду, як гэта рабілі некаторыя аўтарытарныя кіраўнікі ў паўночнай Афрыцы.

У інтэрвію брытанскаму штодзённіку Financial Times Сікорскі сказаў, што Эўразьвяз паступіў правільна, ня выключыўшы Беларусь з праграмы «Ўсходняе партнэрства», нягледзячы на пасьлявыбарчыя рэпрэсіі з боку рэжыму Лукашэнкі супраць апазыцыі.

“Мы лічым, што ўмовы і перавагі «Ўсходняга партнэрства» будуць спрыяць беларускаму народу,” -- заявіў Сікорскі, які знаходзіцца зь візытам у Лёндане.

“Прычына беларускіх эканамічных цяжкасьцяў і палітычнай ізаляцыі -- у сыстэме «Луканомікі» ў эканоміцы і палітычнай сфэры, – дадаў ён – Таму я лічу, што тэма для дыскусіі са спадаром Лукашэнкам - гэта пераход Беларусі да дэмакратыі і ягоны сыход з улады. Для яго было б лепш вучыцца не ў Мубарака ці Кадафі, але браць прыклад з польскага генэрала Ярузэльскага ў 1989 годзе”.

Генэрал Ярузэльскі, апошні камуністычны лідэр Польшчы, падаў у адстаўку пасьля дамовы з апазыцыяй аб правядзеньні дэмакратычных выбараў.

Сікорскі падкрэсьліў, што Польшча пляпуе скарыстаць сваё цяперашняе старшынёўства ў Эўразьвязе, каб узмацніць кантакты з ўсходнімі суседзямі ЭЗ і аднавіць імпульс да пашырэньня Эўразьвязу.

# ЭЎРАДЭПУТАТА НЕ ЎПУСЬЦІЛІ Ў БЕЛАРУСЬ

У ноч з 14 на 15 жніўня ў Беларусь не ўпусьцілі польскага дэпутата Эўрапарлямэнту **Марэка Мігальскага.** Інцыдэнт здарыўся на пункце перасячэньня мяжы Тэрэспаль-Брэст. Палітыка вывелі зь цягніка і адвялі ў зону памежнага кантролю, дзе спадару Мігальскаму паведамілі, што яго ня ўпусьцяць у Беларусь. Пры гэтым яму не далі адказу на пытаньне аб прычыне такога рашэньня.

Варта нагадаць, што ў чэрвені ў Беларусь не прапусьцілі прадстаўніц Нарвэскага Хэльсынскага камітэту расейку **Іну Сангажыеву** і ўкраінку **Вольгу Шамшур**, а таксама журналістак брытанскай BBC **Люсі Эш і Ніку Стардзі**, у ліпені ў краіну не дапусьцілі польскага палітыка, кіраўніка «Вспульноты польскай» **Лангіна Камалоўскага.**

# АЎСТРЫЯ



Аўстрыя-адна з краінаў Еўрапейскага Звязу (1995 г.)

Аўстрыя – парламенцкая федэратыўная рэспубліка, заснаваная на дэмакратычных інстытутах, зацверджаных у адпаведнасці з Дзяржаўнай дамовай ад 15 траўня 1955 года. З прыняццем гэтай дамовы пасляваенная акупацыя краіны саюзнікамі скончылася, і аўстрыйская дзяржава, якая абавязалася выконваць нейтралітэт у міжнародных справах, стала незалежнай. Рэспубліканская форма кіравання, раней пацверджаная Саюзнай радай 30 лістапада 1945 года, увасобілася ў канстытуцыі, якая была складзена па ўзоры канстытуцыі, прынятай у 1920 і мадыфікаванай у 1929 гадах. Усе жыхары краіны карыстаюцца поўнымі грамадзянскімі правамі. Грамадзяне старэйшыя за 19 гадоў маюць права прымаць удзел у выбарах.

Администрацыйна краіна падзяляецца на 9 земляў: Бургенланд (Burgenland), горад Вена (прыраўняны да зямлі, Stadt Wien), Верхняя Аўстрыя (Oberosterreich), Зальцбург (Salzburg), Карынтыя (Karinten), Ніжняя Аўстрыя (Niederosterreich), Ціроль (Tyrol), Фараръльберг (Vorarlberg), Шцірыя (Steiermark). Насельніцтва кожнай з іх абірае свой парламент (ландтаг). Ландтагі ажыццяўляюць любыя паўнамоцтвы, якія не ўваходзяць па канстытуцыі ў прэрагатыву цэнтральнага ўрада. Землі дзеляцца на акругі. У сёлах, невялікіх і сярэдніх гарадах усенародна абіраюцца муніцыпальныя дараднікі, якія абіраюць бургамістраў.

Кіраўніком дзяржавы з'яўляецца прэзідэнт, што абіраецца на падставе ўсеагульнага роўнага прамога выбарчага права шляхам таемнага галасавання тэрмінам на 6 гадоў. Функцыі прэзідэнта вызначаны, у асноўным, дыпламатычным пратаколам і носяць цырыманіяльны характар. Але ў яго паўнамоцтва ўваходзіць таксама прызначэнне Федэральнага канцлера і па яго прапанове іншых чальцоў урада; ажыццяўленне вярхоўнага камандавання федэральным войскам. На працягу ўсяго тэрміна паўнамоцтваў прэзідэнт не мае права займацца якой-небудзь прафесійнай дзейнасцю або ўваходзіць у склад якога-небудзь агульнага прадстаўнічага органа.

Заканадаўчая ўлада. Ажыццяўляецца парламентам, які складаюцца з двух палат: Нацыянальнага і Федэральнага савету. Федэральная рада (бундесрат) рэпрэзентуе федэральныя землі. 64 яго чальцы выбіраюцца дэмакратычна абранымі зямельнымі ландтагамі. Ніжняя палата, нацыянальная рада (нацыянальрат), уяўляе сабой насельніцтва, якое выбірае 183 дэпутаты ў адпаведнасці з прынцыпам прапарцыйнага прадстаўніцтва. Федэральны ўрад (выканаўчая ўлада) узначальваецца федэральным канцлерам. Урад звычайна абіраецца з чальцоў найболей аўтарытэтных партый або партый, прадстаўленых у нацыянальнай радзе. Ён выконвае выканаўчыя і адміністрацыйныя функцыі. Тэрмін паўнамоцтваў федэральнага ўрада залежыць ад ухвалы або неўхваленні яго працы нацыянальнай радай.

Асноўныя партыі краіны прадстаўлены Аўстрыйскай народнай партыяй, Сацыял-дэмакратычнай партыяй Аўстрыі, а таксама Аўстрыйскай партыяй свабоды, якая ў выніку апошніх выбараў, заняла большасць месцаў у парламенце рэспублікі. Высокая ступень палітычнай стабільнасці Аўстрыі забяспечваецца прапарцыйнай сістэмай падзелу дзяржаўных пастоў: калі канцлер абіраецца з адной партыі, то прэзідэнт павінен прыналежаць да іншай.

Судовая ўлада. Суддзі прызначаюцца Міністэрствам юстыцыі. Існуюць адмысловыя суды для пацверджання канстытуцыйнасці заканадаўчай дзейнасці, нагляду за фінансавымі справамі і адміністрацыйным кіраваннем. Маюцца таксама мясцовыя, зямельныя і акруговыя суды, якія разглядаюць як грамадзянскія, так і крымінальныя справы. Існуюць чатыры апеляцыйных зямельных суды больш высокай інстанцыі, Вярхоўны суд і Канстытуцыйны суд.

На сучасным этапе Аўстрыя з'яўляецца чальцом ААН і ўсіх спецыялізаваных агенцтваў гэтай арганізацыі, Еўрапейскай асацыяцыі вольнага гандлю, АБСЕ і Еўрапейскага Звяза.

Яе плошча складае 83,8 тыс. кв. км. Геаграфічнае становішча Аўстрыі спрыяе яе зносінам з іншымі еўрапейскімі краінамі.

Аўстрыя прыналежыць да ліку найбольш развітых краінаў Еўропы. У апошнія гады эканоміка краіны развіваецца паскоранымі тэмпамі. Найбуйным замежным фундатарам з'яўляецца Нямеччына (каля 30% інвестыцый).

Кіроўнымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца машынабудаванне, металургія, а таксама хімічная, цэлюлозна-папяровая, горназдабыўная, тэкстыльная і харчовая галіны. Адна трэцяя частка аб'ёму прамысловай вытворчасці прыходзіцца на дзяржаўны сектар эканомікі.

**Вена-сталіца Аўстрыі**

Вена- федэральная сталіца Аўстрыі і адначасова адна з дзевяці федэральных земляў Аўстрыі, са ўсіх бакоў акружана тэрыторыяй іншай зямлі – Ніжняй Аўстрыі. Размешчана ва ўсходняй частцы краіны. Насельніцтва Вены складае 1,68 млн чалавек (сярэдзіна 2008); разам з прыгарадамі - каля 2,3 млн (больш 25 % насельніцтвы Аўстрыі), і тым самым Вена з'яўляецца самым буйным па насельніцтве горадам Аўстрыі, займаючы пры гэтым дзявятае месца сярод самых буйных гарадоў Еўрапейскага звязу. Культурны, эканамічны і палітычны цэнтр Аўстрыі.

Вена з'яўляецца трэцім горадам-рэзідэнцыяй ААН пасля Нью-Ёрка і Жэневы. Венскі міжнародны цэнтр (так званы UNO-City) уключае ў сябе МАГАТЭ, УНП ААН, Арганізацыі ААН па прамысловым развіцці і інш. У Вене знаходзяцца штаб-кватэры такіх міжнародных арганізацый, як напрыклад АПЕК і АБСЕ.

На працягу стагоддзяў Вена з'яўлялася горадам-рэзідэнцыяй Габсбургаў і адпаведна сталіцай Святой Рымскай імперыі германскай нацыі, ператварыўшыся ў культурны і палітычны цэнтр Еўропы.

# МЕВЛЮТ ЧАВУШОГЛУ



25 студзеня новым кіраўніком Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы (ПАСЕ) абраны турак **Мевлют Чавушоглу**.

Новаму кіраўніку арганізацыі 52 гады, у ПАСЕ ён працуе з 2003 г., калі ён упершыню заняў пост у фракцыі "Еўрапейскіх дэмакратаў", а затым увайшоў у камітэт па маніторынгу абавязкаў краін перад Радай Еўропы і ў прававы камітэт.

Свой першы выступ у новай якасці Чавушоглу пачаў з выказвання падзякі сваёй сям'і, без якой ён не змог бы дамагчыся такога поспеху ў працы на абранай ніве. "Я жадаю аддзячыць свайго бацьку за прышчэпленыя мне каштоўнасці", - сказаў ён.

Чавушоглу таксама паведаміў аўдыторыі пра свой намер засяродзіцца на працы па абароне правоў чалавека, а таксама рэформе Рады Еўропы і Страсбургскага Суда. Выступ турка скончылася заклікам: "За працу!".

# БЕЛЬГІЯ

Бельгія – федэратыўная дзяржава, канстытуцыйная парламенцкая манархія, якая складаецца з супольнасцяў і рэгіёнаў. Супольнасці будуюцца па культурна-лінгвістычным прынцыпе, а рэгіёны – па моўна-тэрытарыяльным. Бельгія ўключае 3 супольнасці: Французскую, Фламандскую і Германамоўную і 3 рэгіёны: Валонскі, Фламандскі і Брусэльскі (двухмоўны), таксама 10 правінцый (Антвэрпэн, Заходняя Фландрыя, Усходняя Фландрыя, Флаамс-Брабант, Лімбург, Брабант-Валон, Энае, Льеж, Намюр, Люксембург). Найболей буйныя гарады Бельгіі: Брусэль, Антвэрпэн, Льеж, Шарлеруа.

Пераход ад унітарнай да федэратыўнай дзяржавы ў Бельгіі адбыўся 1 студзеня 1989 г. у сувязі са шматгадовым канфліктам паміж дзвюма асноўнымі нацыянальнасцямі – фламандцамі і франкамоўнымі валонамі.

У краіне дзейнічае канстытуцыя 1831 г., у якую



неаднаразова ўносіліся змены. Апошнія папраўкі былі зроблены ў 1993 г. Кіраўнік дзяржавы – манарх. Ён афіцыйна завецца "каралём бельгійцаў". Канстытуцыйная папраўка 1999 г., надала жанчынам права займаць трон. Манарх валодае абмежаванымі паўнамоцтвамі, але служыць важным знакам палітычнага адзінства.

Выканаўчая ўлада ажыццяўляецца каралём і ўрадам, які нясе адказнасць перад палатай прадстаўнікоў. Кароль прызначае прэм'ер-міністра як частку ўрада, сем міністраў, якія размаўляюць па-французску, і сем міністраў, якія карыстаюцца нідэрландскай мовай, і шэраг дзяржаўных сакратароў, якія прэзентуюць палітычныя партыі ў кіруючай кааліцыі. Чальцы парламента, якія становяцца чальцамі ўрада, губляюць статут дэпутата аж да чарговых выбараў.

Грамадска-палітычная структура і выбарчая сістэма Бельгіі характарызуюцца шэрагам асаблівасцяў. Унутраная палітыка дзейснага кааліцыйнага ўрада накіравана першым чынам на правядзенне буйнамаштабных рэформаў грамадскага жыцця ў краіне. Неабходнасць іх пазначылася досыць выразна, паколькі за Бельгіяй на працягу ўжо не аднаго дзесяцігоддзя ў ЕС замацаваўся імідж краіны са "млявай грамадскай структурай".

Кааліцыйнаму ўраду ў цэлым атрымалася істотна палепшыць адносіны паміж асноўнымі рэгіёнамі. Гэта было дасягнута на базе рэгулярных нарад прадстаўнікоў федэральнага, рэгіянальных і моўна-супольных урадаў.

Плошча Бельгіі складае – 30,51 тыс. км2. Тэрыторыя малая нават па еўрапейскіх мерках.

Пры адносна малой колькасці жыхароў, Бельгія – адно з самых шчыльна населеных дзяржаваў у свеце. Колькасць насельніцтва Бельгіі – 10,3 млн. чал. (2003). Тэмпы прыросту насельніцтва – 0,15% . Нараджальнасць – 10,58%, смяротнасць – 10,08% Дзіцячая смяротнасць дасягае 4,64 чал. на 1000 нованароджаных. Сярэдняя працягласць жыцця складае 78,13 г., у т.л. жанчын – 81,62, а мужчын – 74,8 (2003г.).

У Бельгіі пражывае каля 900 тыс. замежнікаў. Этнічны склад Бельгіі прадстаўлены наступным чынам: 58% фламандцаў, 31% валлонцаў і 11% змяшаных і іншых этнічных групаў.

Карэннае насельніцтва Бельгіі складаецца з фламандцаў – нашчадкаў франкскіх, фрызскіх і саксонскіх плямёнаў, і валонаў – нашчадкаў кельтаў. Асноўныя рэлігійныя плыні ў Бельгіі такія: каталіцызм (75%), іслам (500 тыс.), пратэстанцызм (каля 150 тыс., у тым ліку англіканская царква – каля 50 тыс.), юдаізм (34 тыс.), з 1988 г. – праваслаўе (40 тыс.).

Дзяржаўныя мовы Бельгіі – галандская, французская і нямецкая. Сталіца – г. Брусэль (959 тыс. чал., 2000). Грашовая адзінка – еўра (са студзеня 2002).

# ШТО ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ МОЖА ДАЦЬ БЕЛАРУСІ

У Еўрапейскага Саюза асаблівыя адносіны са сваімі найбліжэйшымі суседзямі на ўсходніх і паўднёвых межах. Гэта завецца Еўрапейскай палітыкай добрасуседства. Праз гэтую палітыку ЕС падтрымлівае працэсы палітычных, эканамічных і сацыяльных рэформ у суседзяў і збліжае іх з ЕС, асабліва праз паступовую эканамічную інтэграцыю.

Гэта дае магчымасць далейшага пашырэння зоны дабрабыту, стабільнасці і бяспекі, такім чынам, падзяляючы з народам Беларусі даброты, якія ЕС (у які уваходзяць тры суседа Беларусі – Латвія, Літва і Польшча) стварыў на працягу апошніх 50 гадоў.

Еўрапейскі Саюз ужо супрацоўнічае з партнёрамі і суседзямі Беларусі і, вядома, жадаў бы пабудаваць такія ж адносіны з Рэспублікай Беларусь. Гэта б зрабіла ўнесак ва ўмацаванне сувязяў Беларусі з краінамі, якія ўжо з'яўляюцца часткай Еўрапейскай палітыкі добрасуседства, такія як Украіна і Малдова. У той самы час, гэта не парушае традыцыйныя адносіны Беларусі з іншым агульным суседам – Расіяй, якая таксама з'яўляецца і стратэгічным партнёрам ЕС.

**Што ЕС прапаноўвае Беларусі**

Калі Беларусь стане паўнапраўным удзельнікам палітыкі добрасуседства ЕС і, такім чынам яго паўнапраўным партнёрам, ЕС зможа дапамагчы палепшыць якасць жыцця беларусаў.

З гэтай мэтай ЕС і Беларусь маглі бы працаваць разам дзеля дасягнення наступных паляпшэнняў, якімі б непасрэдна скарыстаўся беларускі народ:

- спрошчанае наведванне беларускімі грамадзянамі краін-сябраў ЕС;
- пашыранае трансмежнае супрацоўніцтва, якое спрыяе большаму ўзаемадзеянню ў эканамічным развіцці, ахове навакольнага асяроддзя і памежным мэнэджменце;
- падтрымка беларускай эканомікі, дапамога ў развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і падрыхтоўка беларускіх прадпрыемстваў да далейшых магчымасцяў на Еўрапейскім рынку. Гэта стварыла бы больш працоўных месцаў і забяспечыла лепшыя перспектывы таксама і для маладога пакалення; гэта магло б быць дасягнута праз эканамічныя рэформы, якія б зрабілі Беларусь больш прывабнай для замежных інвестараў. Палепшыла б сістэму аховы здароўя і адукацыі, падтрымку ўразлівых груп насельніцтва; зрабіла б дзяржаўнае і мясцовае кіраванне больш эфектыўным для лепшага аказання паслуг насельніцтву;рэфармаваць прававу і судовую сістэмы з мэтай забеспячэння роўных правоў для ўсіх. Гэта патрабуе незалежных суддзяў, якія працавалі б ў сумленнай і незалежнай манеры, абараняючы правы ўсіх грамадзян і развіццё грамадскай супольнасці.

Супраца з ЕС палепшыла б аўтамабільнае і чыгуначнае спалучэнне Беларусі з яе суседзямі і, такім чынам, спрыяла б паездкам людзей і перамяшчэнню тавараў; палепшыла б стан навакольнага асяроддзя: якасць вады, утылізацыю выкідаў.

Супрацўнічаючы з ЕС беларускія гарады і адміністратыўна-тэрытарыяльныя адзінкі маглі б кантактаваць з гарадамі і муніцыпалітэтамі ў ЕС, абменьваючыся інфармацыяй і досведам ў сферы аказання паслуг насельніцтву.

Беларускім студэнтам прапаноўвалася б больш стыпендый для навучання ва ўніверсітэтах ЕС. Усталяваліся б рэгулярныя і доўгатэрміновыя абмены і ўстойлівыя адносіны паміж беларускімі ўніверсітэтамі і ўніверсітэтамі ЕС на ўсіх узроўнях.

Пры іншым палітычным рэжыме ў Беларусі мог бы быць блізкі дыялог і супрацоўніцтва з дэмакратычна абранымі лідэрамі Беларусі, дзяржаўнымі службоўцамі і экспертамі па шырокаму колу пытанняў, унутраных і міжнародных, значных для нас усіх. Беларускі пункт погляду мог бы быць шырэй пачуты на міжнароднай сцэне.

Сумесная праца стымулявала б вырашэнне агульных, значных пытанняў, падзяляючы і абменьваючыся экспертнымі данными і ноў-хаў у сферы эканомікі і гандлю, сучаснага кіравання, вяршэнства закона, інфармацыі, адукацыі, турызму, культуры, даследаванняў, навукі, энергетыкі, здароўя, сацыяльных пытанняў, навакольнага асяроддзя, транспарта і камунікацый і інш.

Для падтрымкі праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларусі была б істотна павялічана Еўрапейская фінансавая дапамога, і прапанаваны каштоўны досвед у правядзенні рэформ.

Беларусь на цяперашні моманту атрымала значна менш фінансавай дапамогі, чым яе суседзі. Але гэтая сітуацыя магла б змяніцца і Беларусь атрымала б супастаўна столькі ж дапамогі, колькі і яе суседзі, калі б беларускія ўлады зрабілі істотныя крокі насустрач дэмакратызацыі.

**Што ўрад Беларусі можа зрабіць**

На жаль, на гэтым этапе, палітыка, якая праводзіцца аўтарытарным рэжымам прэзідэнта Лукашэнкі, спыняе ЕС ад прапанавання Беларусі поўнага ўдзелу ў палітыцы добрасуседства. Еўрапейскі Саюз не можа прапанаваць паглыбіць гэтыя адносіны з рэжымам, які пазбаўляе сваіх грамадзян фундаментальных дэмакратычных правоў. Народ Беларусі – самая першая ахвяра ізаляцыі, навязанай яму афіцыйнай уладай, але ен жа будзе першым, хто скарыстаецца перавагамі прапаноў для дэмакратычнай Беларусі.

ЕС жадае падзяліць са сваімі суседзямі дабрабыт, стабільнасць, бяспеку, якімі карыстаюцца яго ўласныя грамадзяне. Гэта патрабуе палітычных, эканамічных і адміністрацыйных рэформ ад нашых краін-партнёраў. Падтрымліваючы сваіх суседзяў у гэтых намаганнях, Еўрапейскі Саюз прапаноўвае палітычныя, эканамічныя і гандлёвыя магчымасці, таксама як і фінансавую дапамогу краінам, якія паважаюць правы чалавека, дэмакратыю і вяршэнства закона. Гэта каштоўнасці, якія Беларусь ужо прызнала сама па сваёй уласнай волі, як сябра ААН, АБСЕ і іншых арганізацый, але якія дзеючы беларускі ўрад на практыцы не паважае. Еўропа імкнецца да спынення палітыкі самаізаляцыі Беларусі , якую беларускі ўрад навязаў сваім грамадзянам.

Для гэтага тутэйшым уладам трэба паважаць права народа Беларусі выбіраць сваіх лідэраў дэмакратычным шляхам – іх права чуць усе меркаванні і бачыць усіх кандыдатаў на выбарах; права апазіцыйных кандыдатаў і груп падтрымкі праводзіць кампаніі без прыгнёту, судовага пераследу або турэмнага зняволення; незалежнае назіранне за выбарамі, беларускімі няўрадавымі арганізацыямі ўключна; права волевыяўлення і права на справядлівы падлік галасоў;

# ШТО ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ МОЖА ДАЦЬ БЕЛАРУСІ

– паважаць права народа Беларусі на незалежную інфармацыю, і выказваца вольна, напрыклад, дазваляючы журналістам працаваць без прыгнёту або судовага праследу, не зачыняючы газеты і не перашкаджаючы іх распаўсюджванню;

– паважаць правы недзяржаўных арганізацый, як жыццёва важнай часткі здаровай дэмакратыі – больш не ўскладняць іх легальнае існаванне, не прыгнятаючы і не праследваючы сябраў грамадскіх арганізацый, і дазваляючы ім атрымоўваць міжнародную дапамогу;

– вызваліць усіх палітычных зняволеных - сябраў палітычных апазіцыйных партый і простых грамадзян, арыштаваных падчас мірных дэманстрацый і мітынгаў;

– належным чынам і незалежна расследаваць або перагледзець выпадкі са знікненнем людзей;

– забяспечыць права беларусаў на незалежную і непрадузятую судовую сістэму – з суддзямі, незалежнымі ад палітычнага ціску, без самаўпраўнасці і галаслоўнага крымінальнага судовага праследвання або палітычна-матываванага судовага прысуду, як зняволенне ў турму грамадзян, якія мірна выказваюць свой пункт погляду;

– спыніць адвольныя арышты і затрыманні, дрэннае абыходжанне з людзьмі;

– паважаць правы і свабоды тых беларускіх грамадзян, якія адносяцца да нацыянальных меншасцяў;

– паважаць правы беларусаў як працаўнікоў – іх права ўступаць у прафсаюзы і права прафсаюзаў працаваць на абарону праў людзей;

– паважаць правы беларусаў як прадпрымальнікаў ажыццяўляць дзейнасць без празмернага ўмяшання ўлад;

– далучыцца да адмены смяротнай кары ўслед за іншымі народамі Еўропы;

– выкарыстаць падтрымку, якую АБСЕ, ЕС і іншыя арганізацыі прапаноўваюць Беларусі для дапамогі ў выконванні правоў сваіх грамадзян.

ЕС знаходзіцца ў гатоўнасці аднавіць свае адносіны з Рэспублікай Беларусь і яе народам, як толькі беларускі ўрад прадэманструе павагу да дэмакратычных каштоўнасцяў і асноўных правоў народа Беларусі.

# АДГАВАРЫЦЬ АД БУДАЎНІЦТВА АЭС

Еўрапейская камісія прыняла да ўвагі заклапочанасць Літвы ў сувязі з будаўніцтвам па суседстве з ёй атамных электрастанцый, і падрыхтавала адмысловыя апытальнікі для Расіі і Беларусі пра тое, якія стандарты бяспекі будуць ужыты на АЭС.

Пра дзеянні ЕК прэзідэнта **Далю Грыбаўскайте** інфармаваў старшыня ЕК **Жазэ Мануэль Баррозу**. Таксама ЕК папрасіла Беларусь пазнаёміць з фактарамі ўплыву на навакольнае асяроддзе Астравецкай атамнай электрастанцыі, якія павінны быць выкананы ў адпаведнасці з Канвенцыяй ЭСПОО і іншымі міжнароднымі стандартамі, і прапанавала арганізаваць агульныя кансультацыі. Улічваючы ініцыятыву кіраўніцтва Літвы, 23 чэрвеня еўракамісар **Гюнтер Оцінгер** таксама дамовіўся з прадстаўнікамі Расіі і Беларусі, што гэтыя краіны, ужываючы метадалогію ЕС, правядуць ацэнку рызык і бяспекі існых і планаваных ядзерных электрастанцый – так званыя стрэс-тэсты. Нагадаем, Беларусь плануе будаваць атамную электрастанцыю ўсяго ў 50 кіламетрах ад сталіцы Літвы, Расія – у самай мяжы з Літвой, у Калінінградскай вобласці. Службовыя асобы Літвы асцерагаюцца, што электрастанцыі не адпавядаюць стандартам бяспекі.

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ЕС І БЕЛАРУСІ

Еўрапейскі Звяз развівае і падтрымлівае адмысловыя адносіны з краінамі, якія з'яўляюцца яго найбліжэйшымі суседзямі ўздоўж усходніх і паўднёвых межаў. Гэтыя адносіны вызначаюцца Еўрапейскай палітыкай добрасуседства.

Асноўную дапамогу ад Еўрапейскага звяза Беларусь атрымлівае праз Еўрапейскую праграму добрасуседства і партнёрства.

Аб'ём тэхнічнай дапамогі ЕС, прадстаўленай Беларусі ў перыяд з 1991 г. па 2006 г., ацэньваецца ў 216 мільёнаў ЕЎРА, што складае больш 40% усёй тэхнічнай дапамогі, выдзеленай Беларусі за гэты перыяд. Гэтыя дадзеныя сведчаць пра тое, што Еўрапейскі Звяз з'яўляецца найбуйным шматбаковым донарам тэхнічнай дапамогі Беларусі.

ЕС падае тэхнічную дапамогу Беларусі на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў. Кардынацыйнае бюро з задавальненнем адзначае вынікі супрацоўніцтва, і спадзяецца, што далейшае развіццё супрацоўніцтва ў вобласці міжнароднай тэхнічнай дапамогі прывядзе да значнага паляпшэння адносінаў паміж бакамі.

Па паведамленні Прадстаўніцтва Еўрапейскай Камісіі, яно падтрымлівае ініцыятыву Кардынацыйнага бюро і будзе падтрымліваць інфармацыйную кампанію бюро, неабходную для паляпшэння адносінаў паміж Беларуссю і Еўрапейскім Звязам.

# АРЫШТ БЯЛЯЦКАГА - АДЧАЙ ЛУКАШЭНКІ

Пра гэта шведзкі міністар па эўрапейскіх справах **Брыгіта Ольсан** напісала ў сваім блогу.

У Стакгольме занепакоеныя арыштам вядомага беларускага праваабаронцы Алеся Бяляцкага. У 2006 годзе ён быў атрымаў прэстыжную шведзкую ўзнагароду за працу, накіраваную на разьвіцьцё дэмакратыі і адстойваньне правоў чалавека ў Беларусі.

“Алесь Бяляцкі і ўсе іншыя палітзьняволеныя павінны быць вызваленыя!” – адзначае Брыгіа Ольсан. “Атака беларускага рэжыму на Алеся Бяляцкага азначае напад на беларускі рух за правы чалавека”, - заявіў у Стакгольме лідэр шведзкай праваабарончай арганізацыі “Östgruppens” **Марцін Угла**. Паводле Углы, арганізацыя “Вясна”, якой кіруе Бяляцкі, адыгрывае ключавую ролю ў аказаньні дапамогі пацярпелым ад рэпрэсій рэжыму ў пэрыяд пасьля прэзыдэнцкіх выбараў летась у сьнежні. Сярод іншага, яна ладзіла скаардынаваны збор грошай для аплаты штрафаў, да якіх асудзілі ўдзельнікаў акцый пратэсту.

“Цяпер важна, каб міжнародная супольнасьць адпаведна адрэагавала на сытуацыю і павялічыла ціск на беларускія ўлады з тым, каб былі вызваленыя ўсе палітвязьні”? - падкрэсьліў Марцін Угла.

# “ХРЫШЧЭННЕ НАЦЫІ”



11 жніўня а 18.30 у Віцебску ў сядзібе «Еўрапейскага клуба» (дом № 5 па вуліцы 1-й Сенненскай) адбылася прэзентацыя папулярных беларускіх выданняў: калектыўнай манаграфіі «Хрышчэнне нацыі. Масавыя акцыі 1988-2009», свежых нумароў «ARCHE», а таксама іншых кніжных навінак. У прэзентацыі ўзялі ўдзел рэдактары «ARCHE» Валерка Булгакаў і Алесь Пашкевіч.

У пачатку сустрэчы В. Булгакаў выказаў шчырую падзяку гаспадару “Еўрапейскага клуба” Хрыстафору Жаляпаву і зазначыў, што “ без яго гарачага сэрца” падобныя спатканні былі б папросту немагчымыя.

Далей размова засярodзілася на кнізе “Хрышчэнне нацыі. Масавыя акцыі 1988-2009”, якая нараджалася не за адзін год. Складальнікі ставілі сабе за мэту: асвятленне і адсочванне масавых апазіцыйных акцый, якія адбыліся за апошнія 20 гадоў на тэрыторыі РБ, і ў якіх бралі ўдзел больш за 500 чалавек. Над кнігай працавала вялікая група аўтараў і рэдактараў. З Віцебску ў працы ўдзельнічаў Барыс Хамайда, які ласкава прадставіў для гэтага свой асабісты архіў. Кніга зняпраўджвае навязанае лукашэнкаўскай прапагандай ўяўленне, што змаганне з рэжымам-справа адзінак і маргінальных станаў насельніцтва. Яна падае пазітыўнае аблічча людзей, якія змагаюцца за незалежную Беларусь.

У працы брала удзел вялікая група гісторыкаў, сярод якіх Ян Шумскі. Ён падае матэрыялы закрытых паседжанняў ЦК КПСС па Беларусі, што само па сабе сенсайцыйна.

Самае галоўнае-створаны летапіс эпохі, заснаваны на фактах, вусных сведчаннях, дакументальных матэрыялах, якія вельмі дэталёва паказваюць, як, не маючы прававых механізмаў уздзеяння на ўладу, праз вулічныя акцыі беларусы ўплывалі на яе за апошнія 20 гадоў.

Парадаксальна, але факт: прыход Лукашэнкі да ўлады не сцішыў вулічныя пратэсты, а наадварот актывізаваў іх. І гэта выгадна адрознівае нашу краіну не толькі ад Расеі, дзе пратэстныя настроі набліжаюцца да нуля, але адрознівае яе нават ад Украіны. Лукашэнка радыкалізаваў беларускае грамадства. Актыўнасць нацыянальна свядомых эліт выплюснулася ў акцыях пратэсту на вуліцу.

Ужо ўвесну 1996 года 50-60 тысячаў чалавек пратэставала супраць інтэграцыйных памкненняў Лукашэнкі. І здарыўся цуд, гістарычны парадокс: ідэя нацыянальнай незалежнасці, дзякуючы пратэстным дзеянням, стала ідэяй сённяшняга рэжыму. Беларусь жыве сваім уласным жыццём, рухаецца па сваёй уласнай траекторыі, якая не паўтарае траекторыі нашых найбліжэйшых суседзяў.

Як адзначыў спадар Валер, кніга выконвае вялікую тэрапеўтычную ролю: нягледзячы на памкненні афіцыйнай прапаганды апаганіць нашы святыні, прэзентаваць нас і блізкіх нам людзей “ворагамі народу”, “адмарозкамі” мы з’яўляемся часткай вялікага руху, які сілкуецца пазітыўнымі ідэямі і ўяўленнямі пра лёс нацыі. Гэтым мы выгадна адрозніваемся ад палітычна пасіўнай часткі грамадства. Сярод нас вельмі шмат добрых, прыгожых твараў. Як гэта ні пафасна гучыць: у барацьбе за нашыя вартасці і ідэалы, шмат хто цярпеў не толькі пераслед, але і праліў сваю кроў.

Алесь Пашкевіч спыніўся на апошніх тэматычных нумарах часопісу “ARCHE”. Адзін з іх быў прысвечаны паўстанню 1863-1864 гг.. У ім распавядаецца пра самі падзеі і іх ўдзельнікаў, пераслед і здушэнне змагароў. У нумары ўпершыню друкуецца невядомы партрэт Каліноўскага, змешчаны і на вокладцы і ў тэксце.

Вельмі цікавым будзе сустрэча і з недаўна выдадзеным “ Расійска-беларускім слоўнікам” Сцяпана Некрашэвіча і Міколы Байкова, які ўпершыню пабачыў свет з тых часоў, калі быў пушчаны пад нож пасля свайго выхаду ў 1928 годзе накладам 7000 асобнікаў. Да лёсу слоўніка падобныя і лёсы ягоных стваральнікаў – С.Некрашэвіча і М. Байкова, якія былі растраляныя сталінскімі сатрапамі. Адказваючы на пытанне адной з прысутных Валер Булгакаў патлумачыў сваё разуменне нацыяналізму. Для яго нацыяналізм-гэта дактрына, якая сцвярджае прыярытэт нацыянальнай мовы і культуры. Беларускі нацыяналізм, як, да прыкладу і ўкраінскі, і літоўскі, і латыскі-еўрапацэнтрычны. Гэта значыць, што Еўропа – наша цывілізацыя, да якой мы мусім імкнуцца.

Нацыяналізм-гэта не вернасць крыві, бо такое меркаванне расцэньваецца сёння, як анахранізм. Гэта перш за ўсё-інтэлектуальны рух, які бурыць аўтарытарныя рэжымы, што само пасабе вельмі пазітыўна. Дзякуючы беларускаму нацыяналізму рэжым Лукашэнкі перажывае сёння вялікія цяжкасці. Людзі, якія 19 снежня выйшлі на плошчы сталіцы-гэта ў пеўнай ступені – нацыяналісты, якіх вяла ідэя лепшага жыцця і лепшай долі для беларускай нацыі, яе далучэння да Еўрапейскага кантэксту.

Усе ахвотныя напрыканцы сустрэчы мелі зручную магчымасць набыць добрую і запатрабаваную для любога інтэлектуала літаратуру.

С. Горкі

**»РУХ у Еўропу»** – грамадска-палітычная газэта. Выдавец – Віцебская абласная арганізацыя ПАГА «Рух за Свабоду». Выдаецца нерэгулярна. Наклад – 299 асобнікаў. Рэдактар – Сяргей Салодкін. Вёрстка – Сяргей Солідны. Надрукавана на прыватным абсталяванні на свае сродкі і з дапамогаю адзінадумцаў.